На слыху

ЗАДЗЕЙНІЧАЦЬ ДАДАТКОВЫЯ РЭСУРСЫ

Для барацьбы з COVID-19 мабілізуюць усе лабараторыі і прыцягваюць студэнтаў-медыкаў

Міністэрства аховы здароўя мабілізуе ўсе рэсурсы, неабходныя для тэсціравання на каранавірусную інфекцыю. Для гэтага перапрафілююцца ўсе лабараторыі, на базе якіх могуць выконвацца даследаванні метадам ПЛР, паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя.

Як і падчас першай хвалі COVID-19, зараз будуць задзейнічаныя рэсурсы прыватных медыцынскіх цэнтраў і лабараторных сетак. Пры гэтым ведамства выказала падзяку кіраўнікам прыватных лабараторый за падтрымку і ўзаемадапамогу. Усяго ў Беларусі больш за паўсотні лабараторый маюць права праводзіць тэсціраванне на каранавірусную інфекцыю метадам ПЛР.

Да аказання медыцынскай дапамогі пацыентам з COVID-19 прыцягнута і больш за 2,5 тысячы студэнтаў старэйшых курсаў медуніверсітэтаў. Адпаведны загад № 1174 ад 6 лістапада падпісаны ў Міністэрстве аховы здароўя.

Адзначым, што такая практыка ў медыцынскіх універсітэтах традыцыйная. Восенню ці вясной, з улікам пагаршэння санітарна-эпідэміялагічнага становішча, студэнты старэйшых курсаў, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю па спецыяльнасцях «лячэбная справа», «педыятрыя», «медыка-псіхалагічная справа», накіроўваюцца ў арганізацыі аховы здароўя. Вясной падчас першай хвалі яны ўжо аказвалі такую дапамогу.

Кіраўніцтва ўніверсітэтаў мусіць забяспечыць умовы для самастойнага засваення студэнтамі прапушчаных адукацыйных праграм. Гаворка ідзе пра тое, што тэмы, якія засталіся да сесіі, студэнты павінны асвоіць самі — у вольны ад работы час.

Для падрыхтоўкі студэнтаў да работы з COVID-19 ва ўсіх універсітэтах арганізаваны часовыя сімуляцыйныя цэнтры імітацыі «чырвонай зоны». Яны неабходныя для адпрацоўкі студэнтамі навыкаў аказання дапамогі пацыентам з COVID-19, у тым ліку для навучання правільнаму прымяненню сродкаў індывідуальнай аховы.

На перыяд удзелу ў аказанні меддапамогі студэнтам даюць права працаваць на пасадах медработнікаў, якія адпавядаюць узроўню іх падрыхтоўкі. Аплачвацца праца будзе паводле займаемай пасады, уключаючы надбаўку за работу ва ўмовах, звязаных з COVID-19. Студэнты будуць забяспечаны неабходнымі сродкамі індывідуальнай аховы. А дапамога сістэме аховы здароўя залічыцца як вытворчая практыка.

Тым часам абавязковы масачны рэжым паступова ўвядуць па ўсёй краіне. Пра гэта паведаміў **галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Аляксандр ТАРАСЕНКА.**

З учарашняга дня ён уведзены ва ўсіх раёнах Віцебскай і Мінскай абласцей. На мінулым тыдні яго ўвялі ў Мінску, Магілёве і Бабруйску, Гомельскай вобласці і Брэсце, Наваполацку і Полацку, а таксама іншых раёнах і гарадах. Апошняе слова аб увядзенні такіх мер застаецца за мясцовымі ўладамі, якія адсочваюць эпідэміялагічную абстаноўку.

— Месцаў хапае, ёсць запас, рэзерв. У выпадку неабходнасці ёсць план па разгортванні дадатковых ложкаў для барацьбы з каранавіруснай інфекцыяй. Для пацыентаў з COVID-19 у бальніцах задзейнічана каля 30 % ложкавага фонду, — расказаў Аляксандр Тарасенка.

Ён адзначыў, што па цяжары працякання хваробы розніцы ў другую хвалю у параўнанні з першай няма.

У Беларусі на 16 лістапада зарэгістравана 115 тысяч 448 чалавек са станоўчым тэстам на COVID-19. Прырост за суткі склаў 1263 выпадкі.

Паправіліся і выпісаныя 96 тысяч 462 пацыенты, у якіх раней быў пацверджаны дыягназ COVID-19 (619 за суткі). За ўвесь перыяд распаўсюджвання інфекцыі на тэрыторыі краіны памерлі 1053 пацыенты з выяўленай каранавіруснай інфекцыяй (сем за суткі). Усяго праведзена 2 мільёны 903 тысячы 032 тэсты (20 289 за суткі).

Алена КРАВЕЦ.

Сартуеш смецце і маеш талент? Стань зоркай!

Таленавітым беларусам, якія збіраюць смецце асобна, Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў і рух «Мэта 99» прапануюць «прызнацца» ў сваіх творчых здольнасцях і расказаць пра іх усёй краіне ў конкурсе #ЧИСТОСЕРДЕЧНОЕПРИЗВАНИЕ. Уладальнікі самых цікавых «прызнанняў» атрымаюць у падарунак наборы дамашніх кантэйнераў для раздзельнага збору адходаў. А галоўнымі трыумфатарамі, вызначанымі журы, у кожнай вобласці і ў сталіцы стануць па два чалавекі, прызам для якіх будзе фотасесія і білборды з фота, што размесцяць у рэгіёнах, дзе жывуць пераможцы.

— Сарціроўка смецця — не нагода для гонару, а частка штодзённага жыцця, якая робіць наш двор, раён і горад лепшымі. А вось таленты — нагода адчуць сябе асаблівым і пахваліцца імі перад усімі, — лічыць **Ніна КУЛЬБЕДА-КАМШЫЛАВА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** — Вы вырасцілі найпрыгажэйшыя архідэі? Штораніцы прабягаеце па дзесяць кіламетраў? Выразаеце па дрэве як ніхто іншы? Лепш за ўсіх іграеце на гітары? Можа, умееце рамантаваць усё, што заўгодна? Падзяліцеся сваім талентам і станьце вядомыя ў сваім рэгіёне!

Каб паўдзельнічаць у конкурсе, да 22 лістапада трэба зайсці на сайт http://target99.by, запоўніць форму і размясціць здымак з дэманстрацыяй свайго таленту і апісаннем, у чым менавіта вы майстар. А яшчэ расказаць, як вы сартуеце смецце. Падаваць заяўку могуць паўналетнія беларусы і асобы, якія маюць від на жыхарства, толькі адзін раз і з адной прылады.

Кожнаму ўдзельніку спаборніцтва на электронны адрас дашлюць спасылку на ўнікальны борд з фота канкурсанта, якія згенерыруюць на сайце target99.by. Арганізатары запрашаюць падзяліцца сваім бордам, які і стане конкурснай работай прэтэндэнта, з сябрамі, каб атрымаць як мага больш «лайкаў». Пры гэтым сістэма ўлічвае толькі адзін голас з адной прылады. Борды, якія назбіраюць 50 «лайкаў», аўтаматычна выходзяць у фінал.

Фінальныя работы будзе ацэньваць журы, якое ўлічыць арыгінальнасць і шчырасць прызнання ў сваім таленце. 30 лістапада вынікі конкурсу і імёны пераможцаў з'явяцца на сайце Аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў.

Падтрымаць удзельнікаў і пабачыць борды з іх «прызнаннямі» можна па спасылцы https://promo.target99.by. Свае гісторыі на конкурс даслала ўжо больш за 60 чалавек. Далучайцеся і вы — атрымайце магчымасць праславіцца!

Ірына СІДАРОК.

Надвор'е

ПЯРЭДАДЗЕНЬ ЗІМЫ — ГЭТА КАЛІ І ЎДЗЕНЬ КАЛЯ НУЛЯ

А замаразкі ўначы ў гэты час — да пяці градусаў з мінусам

У мінулыя выхадныя ў нас месцамі ўсталявалася снежнае покрыва. Праўда, ляжаў першы снег нядоўга і быў зусім слабы. Паводле апошніх даных, невялікі снег захоўваецца ў паўночна-ўсходніх раёнах Магілёўскай вобласці. Але на гэтым тыдні ападкі будуць у асноўным у выглядзе таго ж мокрага снегу. І цяпер у многіх рэгіёнах усталюецца снежнае покрыва, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А сёння ўмовы надвор'я ў краіне будуць вызначаць атмасферныя франты, якія ссоўваюцца з боку Заходняй Еўропы. Тэмпература паветра складзе ад мінус 2 градусаў да плюс 4, па паўднёвым захадзе — 5—10 цяпла. У сераду будзе таксама воблачна з праясненнямі. На большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, а па ўсходзе — з мокрым снегам. Месцамі чакаецца туман, па ўсходзе — галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёвы, паўднёва-заходні ўмераны, удзень па поўначы парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў па ўсходзе да плюс 7 па захадзе краіны. Удзень будзе 2—9 цяпла, па ўсходзе — каля нуля.

А вось у чацвер атмасферны ціск павысіцца. На большай частцы тэрыторыі краіны ападкі спыняцца. Толькі ўначы і раніцай пераважна па паўночным усходзе, месцамі чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах магчымы слабы туман, па ўсходзе ўначы і раніцай слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Вецер прагназуецца паўднёвы, паўднёва-заходні парывісты, раніцай і ўдзень месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 7 градусаў, па паўднёвым усходзе — 1-3 марозу. Удзень будзе 3—10 цяпла, па паўднёвым усходзе — ад нуля да плюс 2 градусаў.

У канцы другой дэкады месяца чарговая сістэма атмасферных франтоў з Заходняй Еўропы прынясе шмат аблокаў і ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу на большую частку тэрыторыі краіны. Месцамі будуць слабыя туманы, магчымы слабы галалёд. У пятніцу вецер прагназуецца паўднёвы парывісты, у начныя гадзіны па поўначы моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 5 цяпла, па паўднёвым усходзе пры праясненнях — да мінус 4 градусаў. Удзень будзе ад нуля да плюс 7 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у гэтыя выхадныя тэмпературны рэжым у многіх раёнах Беларусі наблізіцца да кліматычных нормаў позняй восені. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 5 градусаў, удзень будзе ад 2 марозу да 4 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Ханоі падпісана найбуйнейшае пагадненне аб свабодным гандлі

Як паведаміла Bloomberg, найбуйнейшае ў свеце гандлёвае пагадненне было падпісана ў рамках саміту Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН), які адбыўся ў Ханоі пад старшынствам В'етнама ў рэжыме тэлемоста. Глабальную здзелку адобрылі Бруней, В'етнам, Інданезія, Камбоджа, Лаос, Малайзія, М'янма, Сінгапур, Тайланд, Філіпіны, Аўстралія, Кітай, Новая Зеландыя, Паўднёвая Карэя і Японія. Як адзначыла Bloomberg, на ўдзельнікаў прыпадае амаль трэць насельніцтва планеты і сусветнага ВУП — 2,2 мільярда чалавек і $26,2 трлн. Пагадненне аб рэгіянальным усёабдымным эканамічным партнёрстве (RCEP) рыхтавалася з 2012 года, бакі правялі каля 30 раўндаў перамоў. Удзельнікі здзелкі адзначылі, што яна дасць магчымасць умацаваць ланцужкі паставак і кадыфікаваць новыя правілы электроннага гандлю, перадае Bloomberg. Акрамя таго, пагадненне мае на ўвазе адмену тарыфаў як мінімум на 92 % тавараў пры гандлі паміж краінамі-ўдзельніцамі, адзначае агенцтва са спасылкай на міністэрства гандлю Сінгапура. RCEP таксама ўключае меры па спрашчэнні мытных працэдур. Як адзначаецца ў выніковай заяве, пагадненне «будзе спрыяць эканамічнаму росквіту» макрарэгіёна.

На Цэнтральную Амерыку абрынуўся ўраган «Ёта»

Пра гэта паведаміў Нацыянальны цэнтр ЗША па сачэнні за ўраганамі. Спецыялісты ахарактарызавалі «Ёта» як «надзвычай небяспечны ўраган чацвёртай катэгорыі». Паводле даных цэнтра, ураган узмацняўся па меры таго, як ён накіроўваўся на захад праз Карыбскі басейн да мяжы паміж Нікарагуа і Гандурасам. Яго максімальная хуткасць дасягала 230 кіламетраў у гадзіну. Цэнтр па сачэнні за ўраганамі прагназуе для Цэнтральнай Амерыкі «вятры з патэнцыйна катастрафічнымі наступствамі, пагрозлівы для жыцця штармавы прыліў і моцныя ліўні». Як вядома, на мінулым тыдні на краіны Цэнтральнай Амерыкі абрынуўся ўраган «Эта». Паводле ацэнак Чырвонага Крыжа, ад наступстваў гэтага стыхійнага бедства пацярпела больш за 2,5 млн чалавек, асабліва жыхары Гандураса, Нікарагуа і Гватэмалы.

Каля Каіра знайшлі больш за сотню 2500-гадовых саркафагаў

Улады Егіпта абвясцілі аб выяўленні па меншай меры сотні старажытных саркафагаў, у некаторых з якіх знойдзены муміі.

Як паведамляе Associated Press, таксама было знойдзена каля 40 пазалочаных статуй. Археалагічныя знаходкі былі зроблены на тэрыторыі вялікага некропаля ў Сакары, што ў 30 кіламетрах на поўдзень ад Каіра. Міністр па справах старажытнасцяў Егіпта Халед Эль-Анані паведаміў, што знойдзеныя саркафагі адносяцца да эпохі Пталамеяў (320 — 30 гг. да н. э.) і перыяду Позняга царства (664 — 332 гг. да н. э.). Артэфакты размяркуюць мінімум паміж трыма музеямі Каіра. Па словах Эль-Анані, у найбліжэйшы час улады Егіпта абвесцяць аб іншых археалагічных знаходках. Сакара 3000 гадоў таму актыўна выкарыстоўвалася для пахаванняў і была галоўным некропалем Мемфіса — сталіцы Старажытнага Егіпта. Цяпер яна належыць да Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.